**Рэспубліканскі фестываль творчасці замежных студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі “Fest-ART.by” пачаўся грандыёзным канцэртам творчых калектываў і сольных выканаўцаў з розных краін свету.**

# “Сёння ж увечары раскажу пра “Fest-ART.by” родным па скайпе!”



Янь Шаа (Кітай, БДУКіМ).

Удзельнікаў фестывалю прывітаў намеснік міністра адукацыі Віктар Віктаравіч Якжык, які адзначыў сімвалічнасць таго, што гэты творчы форум адкрыўся менавіта 17 лістапада ў Міжнародны дзень студэнта, калі студэнты самых розных краін асабліва адчуваюць еднасць сваёй вялікай шматкультурнай супольнасці. Невыпадковы і дэвіз фестывалю — “Міжкультурныя зносіны праз творчасць і адукацыю”: пераважная большасць фестывальных мерапрыемстваў будзе мець менавіта культурна-адукацыйны падтэкст, а агульнай зразумелай для ўсіх удзельнікаў мовай стане мова творчасці.

Канцэрт-акрыццё фестывалю стаў яскравай дэманстрацыяй талентаў шматнацыянальнай студэнцкай моладзі, якая вучыцца сёння ў Беларусі. Велічным уступным акордам прагучаў студэнцкі гімн “Гаўдэамус” у выкананні зводнага хору ў складзе харавых калектываў “Дамінанта” Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, “Джакоза” Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта і “Cantus Juventae” Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Затым на сцэне заіскрылася ўзнёсла-рамантычная беларуская прэлюдыя: знакавыя танцавальныя, музычныя і тэатральныя кампазіцыі “Белая Русь” (заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь “Ансамбль танца “Белая Русь” Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі), “Белоруссия” (Біліке Саймайці і заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь “Ансамбль танца “Крыжачок” БДУ), “Дыялогі часу” (подыум-школа “Fashion Style” НЦМТДіМ і тэатр моды “ЭТМ” Беларускага інстытута правазнаўства)... І шматколерны творчы веер раскрыўся! На сцэну выходзілі па чарзе то замежныя (з Ірана, Кітая, Казахстана, Узбекістана і многіх іншых краін), то беларускія студэнты-артысты, прымушаючы перапоўненую актавую залу Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта жыць адной святочнай і, здавалася, няспыннай фестывальнай эмоцыяй...



Іранскія студэнты з Белдзяржмедуніверсітэта.

Хто ж яны, такія непадобныя адзін да аднаго ўдзельнікі фестывалю творчасці замежных студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі “Fest-ART.by”? Вось толькі некалькі імёнаў студэнтаў, з якімі ўдалося перакінуцца парай-тройкай фраз непасрэдна адразу пасля канцэрта. Максат Есполаў (Казахстан), студэнт Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, вядучы канцэрта; Чжан Юань (Кітай), студэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, яшчэ адзін вядучы; Махамадзі Махамад (Іран), студэнт Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, адзін з выканаўцаў інструментальнай кампазіцыі “Персідскія матывы” (іграў на нацыянальным народным інструменце, які называецца даф); Вольга Камлёнак (Беларусь), студэнтка Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, вядучая канцэрта; Філіпус Ітэмбу (Намібія), удзельнік інтэрнацыянальнага хору “Дамінанта” Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта (у хоры спяваюць прадстаўнікі трынаццаці краін!)... Спецыяльна не прыводжу тут іх асобныя цытаты, сэнс якіх быў прыблізна аднолькавы (“Гэта здорава, што існуе такі фестываль. Для нас быў вельмі вялікі гонар прадстаўляць сваю краіну, сваю вышэйшую навучальную ўстанову. Тут, на фестывалі, мы знайшлі шмат сяброў. Тут рэальна ўзбагачаешся культурным вопытам прадстаўнікоў іншых народаў...”). Было відаць, што іх перапаўнялі сапраўды шчаслівыя эмоцыі, у прыватнасці, Чжан Юань прызнаўся: “Сёння ж увечары раскажу пра фестываль “Fest-ART.by” родным па скайпе!”.

— Фестываль “Fest-ART.by” упершыню быў праведзены ў 2003 годзе. Ці можна ў дадзеным выпадку гаварыць пра пэўны творчы рост форуму? Наогул, з кожным годам усё цяжэй ці лягчэй ладзіць гэтае мерапрыемства? — звярнуўся я да начальніка аддзела сацыякультурных праектаў і маладзёжных ініцыятыў Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Алены Лаўрыновіч.

— Мне цяжка меркаваць, наколькі мяняецца выканальніцкі ўзровень удзельнікаў. Тут гэта не галоўнае. А галоўнае — тая шчырасць і тое, можна сказаць, глабальнае шчасце, якія сыходзяць ад выканаўцы, калі ён прадстаўляе на сцэне сваю шматвекавую нацыянальную культуру. А гэтыя рэчы мы бачылі і восем гадоў назад, і вось толькі што сёння... Парадокс фестывалю ў тым, што ён не мае ні геаграфічных, ні часавых межаў. Цяжка нават сказаць, калі ён пачаўся, калі ён скончыцца, бо штораз ён, як алмаз, паварочваецца новай гранню на мерапрыемствах рэспубліканскага маштабу, на сустрэчах мінскай студэнцкай моладзі, на пасяджэннях зямляцтваў... Асабліва радуе, што ўсё большую і большую цікавасць да фестывальных мерапрыемстваў праяўляюць беларускія студэнты, як тое і мае на ўвазе двухвектарная скіраванасць форуму — на ўзаемадзеянне... Ці “Fest-ART.by” стаў ужо традыцыяй? Я адкажу, што гэты праект знаходзіцца ўжо на трэцім этапе вядомай формулы любой прагрэсіўнай інавацыі. На першым, у 2003 годзе, не верылі: “Гэтага не можа быць!”. На другім, недзе ў годзе 2007-м, прыглядаліся: “У гэтым нешта ёсць!”. Сёння надышла пара здзіўляцца: “А вы хіба яшчэ не чулі пра “Fest-ART.by”?

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@nastgaz.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

ISSN 1994-9146
9 771994 914000 11142

Галоўны рэдактар Вадзім Кнышаў